**Дата вступления в силу**
28.12.2021

## ПРАТАКОЛ ПАМІЖ УРАДАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І УРАДАМ УКРАІНЫ АБ УНЯСЕННІ ЗМЕНАЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У ПАГАДНЕННЕ ПАМІЖ УРАДАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І УРАДАМ УКРАІНЫ АБ МІЖНАРОДНЫХ АЎТАМАБІЛЬНЫХ ЗНОСІНАХ АД 17 СНЕЖНЯ 1992 ГОДА

Урад Рэспублікі Беларусь і Урад Украіны (далей - Бакі), кіруючыся імкненнем працягваць развіццё двухбаковых адносін з мэтай спрашчэння міжнародных аўтамабільных перавозак паміж дзьвюма дзяржавамі, а таксама транзітам па іх тэрыторыі і перавозак з трэціх і ў трэція дзяржавы дамовіліся ўнесці змены і дапаўненні ў Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Украіны аб міжнародных аўтамабільных зносінах ад 17 снежня 1992 года (далей - Пагадненне):

**Артыкул 1**

Артыкул 3 Пагаднення выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Дазволаў не патрабуецца на выкананне нерэгулярных перавозак пасажыраў аўтобусамі.

Пры выкананні нерэгулярных перавозак пасажыраў вадзіцель аўтобуса абавязаны мець спіс пасажыраў, афармлены ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам.".

**Артыкул 2**

Артыкул 4 Пагаднення выключыць.

**Артыкул 3**

Артыкул 5 Пагаднення выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Перавозкі грузаў паміж тэрыторыямі дзяржаў Бакоў, транзітам праз іх тэрыторыі, а таксама перавозкі з трэціх і ў трэція дзяржавы ажыццяўляюцца без дазволаў грузавымі аўтамабілямі з прычэпамі або паўпрычэпамі або без іх.".

**Артыкул 4**

Артыкул 6 Пагаднення выключыць.

**Артыкул 5**

Артыкул 8 Пагаднення выключыць.

**Артыкул 6**

Частку 2 артыкула 10 Пагаднення выключыць.

**Артыкул 7**

Частку 2 артыкула 12 Пагаднення выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Дазволы, прадугледжаныя артыкулам 7, і іншыя дакументы, неабходныя ў адпаведнасці з гэтым Пагадненнем, павінны знаходзіцца на борце транспартнага сродку, да якога яны адносяцца, і прад'яўляцца па патрабаванні кампетэнтных кантралюючых органаў Бакоў.".

**Артыкул 8**

Дадаць да артыкула 12 Пагаднення наступную частку:

"Грамадзяне Рэспублікі Беларусь і Украіны - члены экіпажаў аўтобусаў, якія ажыццяўляюць

рэгулярныя перавозкі пасажыраў, а таксама вадзіцелі грузавых аўтамабіляў, якія ажыццяўляюць міжнародныя грузавыя перавозкі, пры наяўнасці пацвярджальных дакументаў могуць знаходзіцца на тэрыторыі дзяржаў Бакоў 180 дзён на працягу кожных паўгода.".

**Артыкул 9**

Дадзены Пратакол з'яўляецца неад'емнай часткай Пагаднення і заключаецца на тэрмін дзеяння Пагаднення. Дадзены Пратакол уступае ў сілу з даты атрымання па дыпламатычных каналах апошняга пісьмовага паведамлення аб выкананні Бакамі ўнутрыдзяржаўных працэдур, неабходных для ўступлення ў сілу дадзенага Пратакола.

Здзейснена ў горадзе Мінску 6 лютага 2020 года ў двух экзэмплярах, кожны на беларускай і ўкраінскай мовах, прычым абодва тэксты маюць аднолькавую сілу.

| | |
|---|---|
| За Урад<br>Рэспублікі Беларусь<br>Подпіс | За Урад<br>Украіны<br>Подпіс |